*банчык*" вырабляўся ў Менску ў фантастычнай колькасьці — 8 мільёнаў кубамэтраў за год. Хапіла ўсім.

Кароткая эпоха „*кабанчыка*" скончылася ў 80-ыя. Пакладзеныя абы-як пліткі пакрысе адвальваліся з бэтонных муроў. Сёньня, каб не рызыкаваць жыцьцямі людзей, „*кабанчык*" адкалупваюць самі будаўнікі. Міне яшчэ колькі часу — і ён зусім аблезе з твару нашае зямлі як яскравы прыклад колішняга савецкага „единообразия".

# Кава

***Сяргей Шупа***

*Кава* — слова вельмі беларускае. Гэта добра ведаюць тыя, каму даводзілася замаўляць гэты напой у якім-небудзь менскім гастраноме. Гэтае слова — як лякмусавая паперка, паводле яго цябе ідэнтыфікуюць у чарзе як беларуса.

Слова *кава* прыйшло да нас з Усходу — з Асманскай імпэрыі, а асманскія туркі пазычылі яго ад арабаў, у якіх яно гучала „*qahwa*". А вось да расейцаў, прыкладам, *кава* прыйшла значна пазьней і з Захаду — таму расейскае слова „кофе" зусім непадобнае да нашага і застаецца дагэтуль чужое для самой расейскай мовы, якая так і ня здолела яго прыстасаваць да сваёй сыстэмы.

*Кава* для Беларусі — новы нацыянальны сымбаль, знак далучанасьці да паўзабытай намі эўрапейскай цывілізацыі. „*Кавы*", — папросім мы — і нас зразумеюць у любой кавярні ў Польшчы, Літве, Чэхіі, Славаччыне, Украіне, карацей кажучы — у НАШАЙ Эўропе.

...Мы надоўга сыходзім у цемру ночы або ў шэрасьць дня, каб аднойчы на золку вярнуцца да старога сябра, які, перш чым пра што-небудзь запытацца, пачастуе нас добрай *кавай*.

# Каваль

***Юрась Бушлякоў***

У *каваля* на зямлі свой адвечны клопат — *каваць*. *Каваль* — стваральнік, *выкоўваючы* мэтал, ён *куе* сваю долю. У нашага *каваля* шмат славянскіх блізьнят: разам з рамяством замацавалася гэтае слова шчэ ў праславянскую пару. Беларускія *кавалі* ў даўніну былі аднначасна гутнікамі — вытаплялі з руды жалеза. Пазьней, у часе *кавальскага* буму, не рабілі ўсе *кавалі* аднаго й таго ж самага — мелі свае дзялянкі: адзін мечнікам працаваў, другі замкі вырабляў, а трэйці толькі за нажы браўся. Ня менш як тры гады займала навука *кавальства* — пасьля *кавалёвы* вучні станавіліся *кавалькамі*. Каб прызналі за майстра, мусіў *кавалёк* зрабіць штуку — *выкаваць* што-колечы бяз помачы. На мяжы мінулага ды нашага стагодзьдзяў пакідалі ў нас *кавалі* грамадзкія кузьні ў гарадох — куплялі ўласныя дый асядалі ў вёсках. А там заўжды было поўна працы — калёсы *акаваць*, коні *падкаваць*, зрабіць сярпок ці матычку, сякерку або сьвярдзёлак... Цанілі *каваля* — вялікі ён чалавек на зямлі. Данеслася пра гэта ў аднэй гісторыі, дзе *каваль* саграшыў быў, а сьлесара павесілі. Ведалі ўсе, што *добры каваль рук не апячэ*, у яго *куецца ўсё й плешчацца*. Якога ліха маглі чакаць адно ад *кавалíхі*, аднак тое ўжо льга было вытрываць... Але прыйшла савецкая індустрыялізацыя і клопат *кавалёў* абмежавала: шчыравалі тыя ў